# КАНТРОЛЬНЫЯ ТЭСТЫ ПА ДЗЕЯСЛОВЕ

## Тэст 1

**1. Адзначце спрагальныя формы дзеяслова:**

1) інфінітыў;
2) асабовая форма
3) форма прошлага часу;
4) дзеепрыметнік;
5) дзеепрыслоўе.

**2. Адзначце агульныя прыметы, уласцівыя ўсім дзеяслоўным формам:**

1) катэгорыя часу;
2) лексічнае значэнне;
3) катэгорыя трывання;
4) катэгорыя стану;
5) кіраванне;
6) прымыканне прыслоўяў;
7) сінтаксічная функцыя.

**3. Вызначце сінтаксічную ролю інфінітыва ў сказах:**

а) дзейнік; б) выказнік; в) азначэнне; г) дапаўненне; д)акалічнасць

1. У гісторыі не фантазія, не творчы вымысел павінны кіраваць рукой даследчыка, а карпатлівая праца і асэнсаванне матэрыялу, назапашанага на працягу стагоддзяў. (А.Траяноўскі)
2. Мы перасеклі возера і спыніліся начаваць у лесе. (І.Шамякін)
3. За бацькава сварыцца – і смех і грэх. (Прыказка)
4. Васілёвы паходы ў лес дапамагаюць сям'і жыць. (І.Навуменка)
5. Не кожны з прысутных вызначаўся ўменнем разважаць і пераконваць. (Ц.Гартны)

**4. Адзначце дзеяслоўныя формы, якія ўтварыліся ад асновы інфінітыва:**

1) звесіўшы;
2) падыходзячы;
3) кармлю;
4) прывёз;
5) узышоўшы.

**5. Вызначце значэнне зваротнай формы выдзеленых дзеясловаў:**

а) уласна-зваротнае; б) узаемна-зваротнае; в) агульна-зваротнае; г) ускосна-зваротнае; д) якасна-зваротнае

1. Усе **распрануліся**, чаго не бывала раней на вячорках, і селі за стол для зусім небывалай работы. (Я.Брыль)
2. Хмара ішла супраць ветру, і таму яна **сунулася** вельмі марудна, часам нават здавалася, што чарната яе не набліжаецца сюды, а трохі аблегчана адсоўваецца за лес. (Я.Сіпакоў)
3. Недалёка ад нас, на суседняй дзялянцы, **перагукваліся** дзеці. (Р.Няхай)
4. Чырвоны камочак. Ну што ў ім, здаецца, – трапечацца ж, **б'ецца**, спачыну не знае… Калі прыгадаем маленькае сэрца, чаго яно толькі ў сабе не змяшчае? (П.Броўка)
5. Пятрусь два разы гарэў, два разы **будаваўся.** (Я.Брыль)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**6. Адзначце суадносныя трывальныя пары дзеясловаў:**

1) бегчы – бегаць;
2) завезці – завозіць;
3) лятаць – адлятаць;
4) разысціся – разыходзіцца;
5) пісаць – запісаць.

**7. Адзначце дзеясловы:**

а) якія ўваходзяць у трывальную пару; б) няпарныя (аднатрывальныя) дзеясловы закончанага або незакончанага трывання; в) двухтрывальныя дзеясловы

1) нейтралізаваць;
2) расхварэцца;
3) вынесці;
4) жаць;
5) замінаць.

**8. Адзначце дзеясловы з памылкамі ва ўтварэнні формаў загаднага ладу:**

1) паслаць – пасылай;
2) пакласці – давайце пакладзем;
3) глянуць – гляньма;
4) шукаць – давайце шукаць;
5) прывезці – прывязём.

**9. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 1-й асобы множнага ліку маюць канчатак *–ам*:**

1) злізаць;
2) счасаць;
3) бразгатаць;
4) пляскаць;
5) смялець.

**10. Адзначце дзеясловы, якія ў форме ІІ-й асобы множнага ліку маюць канчатак *–еце*:**

1) замесці;
2) адысці;
3) напасці;
4) прапускаць;
5) павесяліць.

**11. Адзначце дзеясловы, якія ў форме ІІ-й асобы множнага ліку маюць канчатак *–ыце (-іце)*:**

1) сядзець;
2) бегчы;
3) рашаць;
4) абвіць;
5) належаць.

**12. Адзначце дзеясловы, якія ў форме ІІ-й асобы множнага ліку маюць канчатак *–аце (-яце)*:**

1) імкнуцца;
2) крычаць;
3) засмяяцца;
4) будзіць;
5) жаваць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**13. Адзначце дзеясловы, ад якіх парныя паводле трывання дзеясловы ўтвараюцца пры дапамозе суфікса *–ыва- (-іва-)*:**

1) выпісаць;
2) дайграць;
3) адкроіць;
4) падлічыць;
5) распытаць.

**14. Адзначце дзеясловы, якія ўтварыліся:**

а) суфіксальным; б) прыставачным; в) прыставачна-суфіксальным; г) постфіксальным; д) прыставачна-постфіксальным спосабамі

1) займацца;
2) абілецціць;
3) раскрычацца;
4) прадбачыць;
5) нукаць.

**15. Адзначце словазлучэнні з правільным ужываннем дзеепрыметнікаў:**

1) авеяны легендай;
2) падклеяны ліст;
3) згарэўшы будынак;
4) непрадбачаныя абставіны;
5) палепшаныя ўмовы.

**16. Адзначце сказы з памылковым ужываннем дзеепрыслоўяў:**

1. Выцягваючы з балота жэрдкі, нам трэба была дапамога.
2. Гледзячы на мукі дзеда, нам хацелася крычаць.
3. Спадзяваўшыся на сябра, Віктар браў самыя складаныя пытанні.
4. Паснедаўшы, мы ўзяліся за працу.
5. Ехаўшы да бацькоў, Максім думаў аб нечым сваім.

**17. Адзначце дзеепрыметнікі, якія маюць наступную будову: ¬ ∩^□**

1) авеяны;
2) прыгорблены;
3) пасівелы;
4) разгневаны;
5) збіты.

**18. Адзначце дзеепрыслоўі, якія маюць наступную будову: ∩^^**

1) выгнуўшы;
2) хвалюючыся;
3) памятаючы;
4) абвязаўшы;
5) ідучы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэст 2

**1. Адзначце граматычныя катэгорыі, якія ўласцівы ўсім дзеяслоўным формам:**

1) лад;
2) час;
4) трыванне;
5) стан.

3) спражэнне;

**2. Адзначце граматычныя катэгорыі, якія ўласцівы інфінітыву:**

1) час;
2) пераходнасць;
3) стан;
4) трыванне;
5) зваротнасць.

**3. Вызначце сінтасічную ролю інфінітыва ў сказах:**

а) дзейнік; б) выказнік; в) азначэнне; г) дапаўненне; д) акалічнасць

1. Хлопцы прыпыніліся непадалёку адпачыць. (М.Лынькоў)
2. У хаце вучням не сядзіцца – прайшла ахвота ў іх вучыцца. (Якуб Колас)
3. Дзетак узгадаваць – не грыбкоў назбіраць. (Прыказка)
4. Доўг салдацкай службы патрабаваў ад мяне несці параненага сябра. (І.Шамякін)
5. Вітаю працай кожны дзень і адчуваю, што з гадамі мне хочацца любіць людзей усё мацней, усё адданей. (Л.Дайнека)

**4. Адзначце дзеяслоўныя формы, якія ўтварыліся ад асновы цяперашняга (будучага простага) часу:**

1) гляньма;
2) нёс;
3) бегла;
4) люблю;
5) плёўшы.

**5. Вызначце значэнне зваротнай формы выдзеленых дзеясловаў:**

а) уласна-зваротнае; б) узаемна-зваротнае; в) агульна-зваротнае; г) ускосна-зваротнае; д) якасна-зваротнае

1. Хутка **сабрацца** ў дарогу хлопцам нічога не перашкаджала. (Я.Маўр)
2. Тут **віўся** маленькі ручаёк. Выцякаў ён з крыніц за кіламетры два адсюль, з-пад двух вялікіх узгоркаў. (А.Жук)
3. Ніткі **рваліся**, зляталі з бабіны. (Р. Ігнаценка)
4. **Абняліся, расцалаваліся,** і першае запытанне – пра дубы. (І.Шамякін)
5. Абуўся Арсен, убачыўшы воддаль высозную бярэзіну над канцавой хатай Падгайцаў. (Т.Хадкевіч)

**6. Адзначце суадносныя трывальныя пары дзеясловаў:**

1) ісці – узысці;
2) зайсці – заходзіць;
3) вазіць – завозіць;
4) паўзці – поўзаць;
5) параўнаць – параўноўваць.

**7. Адзначце дзеясловы:**

а) якія ўваходзяць у трывальную пару; б) няпарныя (аднатрывальныя) дзеясловы закончанага або незакончанага трывання; в)двухтрывальныя дзеясловы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

1) прыдбаць;
2) апавядаць;
3) адрасаваць;
4) адаслаць;
5) стаць

**8. Адзначце дзеясловы з памылкамі ва ўтварэнні формаў загаднага ладу:**

1) хадзіць – давай пойдзем;
2) працаваць – працуйма;
3) заносіць – занясі;
4) узяць – бяры;
5) забраць – давайце забярэм.

**9. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 1-й асобы множнага ліку маюць канчатак *–ам*:**

1) пабольшыць;
2) рассмактаць;
3) растрачыць;
4) скаламбурыць;
5) расхацець.

**10. Адзначце дзеясловы, якія ў форме II-й асобы множнага ліку маюць канчатак *–еце*:**

1) атрэсці;
2) звесціся;
3) паглыбець;
4) павесяліць;
5) паспадзявацца.

**11. Адзначце дзеясловы, якія ў форме II-й асобы множнага ліку маюць канчатак *–ыце (-іце)*:**

1) бачыць;
2) кіпець;
3) ламаць;
4) абмануць;
5) абіраць.

**12. Адзначце дзеясловы, якія ў форме II-й асобы множнага ліку маюць канчатак *–аце (-яце)*:**

1) апраўдаць;
2) залепятаць;
3) абцерці;
4) уваткнуцца;
5) упіцца.

**13. Адзначце дзеясловы, ад якіх парныя паводле трывання дзеясловы ўтвараюцца пры дапамозе суфікса *–ыва- (-іва-)*:**

1) запаяць;
2) прыгубіць;
3) апраўдаць;
4) заплюшчыць;
5) абляпіць.

**14. Адзначце дзеясловы, якія ўтварыліся:**

а) суфіксальным; б) прыставачным; в) прыставачна-суфіксальным; г) постфіксальным; д) прыставачна-постфіксальным спосабамі

1) аб'есціся;
2) лайдачыць;
4) падкісліць;
5) недабачыць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3) стукацца;

**15. Адзначце словазлучэнні з правільным ужываннем дзеепрыметнікаў:**

1) ламаемыя галінкі;
2) сапсаваты вечар;
3) абсыплены лісцем;
4) струхлелы пень;
5) склаўшыеся абставіны.

**16. Адзначце сказы з памылковым ужываннем дзеепрыслоўяў:**

1. Даведаўшыся пра вызваленне, нас акрыліла надзея хутка вярнуцца ў родныя мясціны.
2. Выходзячы з пакоя, у вочы кінулася аб’ява.
3. Раптам вёску асвяціў месяц, прарываўшы рэдкую муць пярэстых хмар.
4. Схіліўшыся да ручая, мы са смагай пачалі піць ваду.
5. Слухаючы яго выступленне, нам ад няёмкасці хацелася залезці пад лаўку.

**17. Адзначце дзеепрыметнікі, якія маюць наступную марфемную будову:¬∩^^□**

1) затуманены;
2) зламаны;
3) расстраляны;
4) выпраўлены;
5) аглушаны.

**18. Адзначце дзеепрыслоўі, якія маюць наступную марфемную будову:¬∩^^**

1) пагаварыўшы;
2) азірнуўшыся;
3) ускокваючы;
4) ружавеючы;
5) ушчуваючы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ